УДК 323.15

# ГРЭЧАСКАЯ ДЫЯСПАРА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ У МІЖКУЛЬТУРНЫМ КАНТЭКСЦЕ

А. У. ЦІХАМІРАЎ

*Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі, г. Гродна, Беларусь*

Уплыў грэчаскай культуры на хрысціянства, еўрапейскую цывілізацыю, навуку вельмі цяжка пераацаніць. Беларусь таксама на працягу стагоддзяў адчувала і адчувае ўздзеянне здабыткаў грэчаскай культуры ў самых розных галінах. Хрысціянізацыя беларускіх земляў адбывалася перадусім пад уплывам візантыйскай культуры і можна казаць пра тое, што з самага пачатку гэтага працэсу біблейскія тэксты на грэчаскай мове сталі адным з тых мастоў, якія сімвалізуюць цывілізацыйны ўплыў элінскага свету ў разнастайных яго праявах.

Грэчаская дыяспара ў Беларусі заўсёды была вельмі малалікай і толькі пасля Другой сусветнай вайны назіралася пэўнае павялічэнне лічбы асоб гэтай наыянальнасці. Так, згодна з перапісам насельніцтва 1926 г. у Беларускай ССР пражывала 55 грэкаў [1], паводле перапісу 1939 г. – 199 чалавек [2], у 1959 г. – ужо пражывала 250 грэкаў [3], а ў 1970 г. – 465 [4], у 1979 г. – 503 [5], у 1989 г. – 695 чалавек [6]. Перапісы насельніцтва Рэспублікі Беларусь паказалі наступныя лічбы: у 1999 г. – 743 грэкі (гэта найбольшая колькасць на працягу ўсяго XX ст.), у 2009 г. – ужо 617, а ў 2019 г. – 422 асобы [7, с. 4]. Варта адзначыць, што колькасны склад грэчаскай дыяспары змяняецца пад уздзеяннем розных дэмаграфічных працэсаў, міграцыйнага руху і тэндэнцый асіміляцыйнага характару. Аднак можна меркаваць, што існуюць і іншыя формы сувязі з грэчаскай ідэнтычнасцю, якія маюць характар падвоенай (ці нават больш складанай) тоеснасці. Асабліва гэта тычыцца этнічна змешаных сем'яў. Прадстаўнікі грэчаскай дыяспары адзначаюць, што такіх асоб можа быць значна больш у Беларусі і называюць лічбы да 4–4, 5 тысяч чалавек [8].

Толькі ў другой палове 1990-х гадоў пачаліся арганізацыйныя працэсы ў асяроддзі беларускіх грэкаў. Да гэтага часу не назіралася спробаў арганізацыйнага афармлення дыяспары. У 1997 г. у Мінску было створана таварыства грэчаскай культуры “Алкеста”, якое ў 1999 г. было пераўтворана ў таварыства “Алкестыда” і існавала да 2019 г. Ім кіраваў Цімафей Папунідзі [9, с. 2]. 25 сакавіка 1998 г. у Маладзечне было зарэгістравана Беларускае грамадскае аб'яднанне грэкаў “Пелапанэс”, старшынёй якога з'яўляецца Рафаэль Дэльянаў. Ён нарадзіўся ў 1951 г. у вёсцы Цынцкаро Цалкскага раёна Грузіі, атрымаў вышэйшую адукацыю ў Новачаркаску і большую частку свайго жыцця працаваў тэхнолагам на Маладзечанскім механічным заводзе. Аб'яднанне “Пелапанэс” сёння працягвае сваю дзейнасць, а старшыня арганізацыі ўваходзіць у Кансультатыўны савет пры Рэспубліканскім цэнтры нацыянальных культур [10].

Значная частка грэкаў у Беларусі – гэта выхадцы з розных рэгіёнаў былога Савецкага Саюза. Перадусім гэта традыцыйныя тэрыторыі засялення прыазоўскіх і пантыйскіх (прычарнаморскіх) грэкаў: Данецкая вобласць Украіны, Крым, Растоўская вобласць і Краснадарскі край Расіі, Грузія,

але таксама ёсць выхадцы з розных рэгіёнаў Сібіры, паўночнага Каўказу, Казахстана і Турцыі [11]. Прыазоўе з'яўляецца рэгіёнам, дзе грэкі пражываюць кампактна і складаюць важную частку насельніцтва. Цэнтрам грэчаскай культуры рэгіёна з'яўляецца Марыупаль (Украіна). Грэчаскае насельніцтва басейна Азоўскага і Чорнага мора мае даволі складаную этнічную гісторыю: яно падзяляецца на дзве вялікія групы рамеяў і ўрумаў. Калі першыя гістарычна размаўляюць на дыялектах грэчаскай мовы, то другія ў сувязі з доўгім пражываннем у Крыме і інтэнсіўнымі кантактамі з крымскімі татарамі і туркамі перанялі цюркскія дыялекты і ў выніку ўтварылася асобная ўрумская мова. У наш час грэкі Беларусі ў штодзённым жыцці выкарыстоўваюць перадусім рускую мову.

Магчымасць свабоднай самарэпрэзентацыі культуры сярод прадстаўнікоў іншых этнічных супольнасцей з'яўляецца важным элементам захавання тоеснасці, сувязей паміж рознымі пакаленнямі, магчымасцю пазнаёміць шырокае кола зацікаўленых людзей здабыткамі ўласнай культуры. Таксама розныя формы самарэпрэзентацыі ствараюць падставы для ўзаемадзеяння з іншымі этнасамі. У Беларусі адной з такіх форм самарэпрэзентацыі стаў Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур. Мерапрыемства першы раз было праведзена ў 1996 г. у Гродне і з таго часу пераўтварылася ў падзею, якая аб'ядноўвае прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей. У ім прымаюць удзел самадзейныя артысты і калектывы вельмі розных этнасаў, у тым ліку і малалікіх у Беларусі. Фестываль доўжыцца два гады і складаецца з некалькіх рэгіянальных этапаў, а заключныя мерапрыемствы адбываюцца традыцыйна ў Гродне адзін раз у два гады. Падчас гэтага свята прадстаўнікі розных этнічных супольнасцей маюць магчымасць арганізаваць уласны падворак у старой частцы Гродна і паказаць нацыянальныя песні, танцы, строі, кухню і мастацкую творчасць самых розных напрамкаў.

У першым фестывалі ў 1996 г. грэкі не прымалі ўдзел. Сам жа фестываль у пэўнай ступені стаў штуршком для стварэння арганізацый грэчаскай дыяспары і ўжо падчас другога фестывалю ў 1998 г. быў утвораны асобны грэчаскі падворак. Тады ён быў арганізаваны прадстаўнікамі таварыства “Алкеста” [12, с. 1]. Гэта быў толькі пачатковы этап арганізацыйнага станаўлення дыяспары. Але ўжо тады была прадстаўлена музычная культура і стравы нацыянальнай кухні. З гэтага часу грэчаскі падворак на фестывалі прысутны пастаянна. У 2000 г. грэкаў прадстаўляла таварыства “Алкестыда”, у 2004 годзе – “Пелапанэс”, у 2006 годзе – “Алкестыда” і “Пелапанэс” (тады прымалі ўдзел у фестывалі прадстаўнікі з Маладзечна, Кобрына, Мінска, Віцебска і Магілёва) [13]. З пачатку 2000-х гадоў на ім выступалі нацыянальныя самадзейныя калектывы, эстрадныя выканаўцы Артур Міхайлаў і Артэміс Ахпаш, прафесійныя ансамблі (напрыклад, у 2002 г. – харэаграфічны ансамбль “Вясна” з Магілёва) [14]. На падворку абавязкова гучыць інструмент бузукі, выконваецца танец сіртакі і прысутныя розныя стравы. Напрыклад, у 2018 г. на фестывалі усе ахвотныя маглі не толькі іх каштаваць, але і самастойна прыгатаваць грэчаскі салат [15, с. 4]. Арганізатары кожнага фестываля стараюцца, каб праграма была разнастайнай і паказвала розныя аспекты народнай творчасці. Так, у 2016 г. кожная супольнасць, у тым ліку і грэкі,

рабіла інсцэніроўку традыцыйнага вяселля [16, с. 4]. У 2018 г. на грэчаскім падворку, апрача традыцыйных спеваў і танцаў, з'явіліся постаці старажытнагрэчаскіх багоў, вялікі банэр з літарамі грэчаскага алфавіта, а агульнае афармленне прасторы нагадвала пра Кікладскія астравы [17, с. 7]. Заключныя мерапрыемствы XIII Рэспубліканскага фестываля нацыянальных культур у сувязі з пандэміях хваробы Covid-19 адбыліся толькі 3–5 чэрвеня 2022 г. Некаторыя супольнасці былі аб'яднаныя на адным сумесным падворку. Грэкі выступалі на адным падворку з аматарскім аб'яднаннем "Шматгалоссе" Печынскага гарадскога дома культуры (Барысаўскі раён Мінскай вобласці), у якое ўваходзяць людзі 14 нацыянальнасцей. Апроч традыцыйных спеваў і частавання стравамі нацыянальнай кухні можна было зрабіць сумесны здымак з прадстаўнікамі дыяспары, пераапранутымі ў постаці антычных багоў [18, с. 11].

Асобныя фестывалі грэчаскай культуры ў розных арганізацыйных фарматах адбываюцца таксама і ў Мінску. Так, у 2007 г. у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбыліся пятыя Дні грэчаскай культуры, падчас якіх быў прадстаўлены паэтычны вечар "Эха Элады" і выстава мастакоў Ірыны Гілеп і Паўла Дымітрыядзі [19]. У 2009 г. мерапрыемства адбылося таксама ў Нацыянальнай бібліятэцы і пачалося літаратурнай вечарынай "Пад небам Грэцыі свяшчэннай" [20]. Святы грэчаскай культуры адбыліся таксама ў 2012 і 2017 гг., прычым у 2017 годзе – падчас святкаванняў Дня горада Мінска. 23 верасня 2019 г. ў Верхнім горадзе ў Мінску адбыўся цэлы шэраг дзён розных нацыянальных культур, у тым ліку і грэчаскай. Асноўнымі арганізатарамі выступілі ўлады Мінска, Беларускае грамадскае аб'яднанне грэкаў "Пелапанэс", Пасольства Грэцыі ў Расіі і Беларусі. Усе ахвотныя змаглі паўдзельнічаць у віктарыне аб гісторыі Грэцыі, майстар-класах па грэчаскай мове і грэчаскай кулінарыі, навучыцца танцаваць грэчаскія танцы, пабачыць не толькі эстрадныя нумары, але і прадстаўленне аб алімпійскіх багах і выступленне тэатра гімнастыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры. На святкаванні прысутнічалі вядомыя прадстаўнікі дыяспары, у тым ліку і бізнэсмен, пачэсны консул Грэцыі ў Беларусі Павел Тапузідзіс [21].

Вельмі актыўная грэчаская дыяспара ў Маладзечне праводзіць святкаванні на рэгулярнай аснове. 25 сакавіка 2010 г. – у дзень незалежнасці Грэцыі адбыўся ўрачысты вечар, дзе Р. Дэльянаў прачытаў даклад "Грэчаскі вызвольны рух у 1821–1833 гг.", прагучалі вершы і песні на грэчаскай і беларускай мовах, а ансамбль "Белыя крылы" пад кіраўніцтвам Віктара Барановіча выканаў шэраг новых грэчаскіх танцаў, падрыхтаваных да фестываля нацыянальных культур [22]. Падобныя святкаванні адбыліся ў Брэсце і Магілёве.

З пытаннем захавання саматоеснасці цесна звязана вывучэнне нацыянальнай мовы. Старажытнагрэчаская мова вывучаецца ў Беларусі на працягу некалькіх стагоддзяў і звязана гэта было перадусім з царкоўнай адукацыяй. У XIX – пачатку XX ст. вывучэнне старажытнагрэчаскай мовы (побач з лацінскай) было абавязковай часткай класічнай гімназічнай адукацыі [23]. Напрыклад, вядомы літоўскі філолаг, заснавальнік сучаснага літоўскага мовазнаўства Ёнас Яблонскіс (Іван Яблонскі) (1860–1930), большую частку прафесійнага жыцця выкладаў старажытнагрэчаскую мову, у тым ліку ў гімназіях Брэста і Гродна.

Вядучым цэнтрам вывучэння старажытнагрэчаскай мовы зараз з'яўляецца кафедра класічнай філалогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У Гродзенскім дзяржаўным ўніверсітэце імя Я. Купалы таксама вялася падрыхтоўка класічных філолагаў, а зараз выкладаецца старажытнагрэчаская мова як прадмет на філалагічным факультэце. Старажытнагрэчаская мова таксама выкладаецца ў адукацыйнай сістэме праваслаўнай царквы, каталіцкага касцёла і ВНУ, дзе вядзецца падрыхтоўка тэолагаў.

Новагрэчаская мова выкладаецца ў БДУ, Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце, у рамках факультатыва таксама ў гімназіі № 3 Маладзечна (пры спрыянні аб'яднання “Пелапанэс”) [24].

Сярод вядомых прадстаўнікоў грэчаскай дыяспары варта назваць некалькі асобаў. Пётр Арыстархавіч Маўрадзіядзі (1878–1933) – біёлаг, з 1923 г. – прафесар кафедры заалогіі БДУ, з 1924 г. – стваральнік і прафесар кафедры гісталогіі медыцынскага факультэта БДУ, у 1928–1932 гг. – дырэктар Інстытута біялогіі Інстытута беларускай культуры (Беларускай Акадэміі навук) [25]. Людміла Георгіеўна Гафо (1919–2022) – архітэктар, якая ў пасляваенны час працавала над аднаўленнем Мінска, у 1954–1984 гг. – галоўны архітэктар праектаў у “Мінскпраекце” [26]. Ігар Аляксандраіч Міхайлопула (нар. 1938) – доктар хімічных навук, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, асноўныя працы якога прысвечаны біяагранічнай хіміі, біяхіміі і біятэхналогіі кампанентаў нуклеінавых кіслот [27]. Уладзімір Сяргеевіч Экнадзіёсаў (нар. 1947) – оперны спявак, педагог, рэжысёр, у 1978–1995 гг. – саліст Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра оперы і балета Беларусі (выконваў оперныя партыі па-беларуску), пазней – рэжысёр гэтага тэатра, мастацкі кіраўнік і рэжысёр Маладзечанскага маладёжнага музычнага тэатра [28].

У 2009–2011 гг. пры падтрымцы Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей выдаваўся інфармацыйны бюлетэнь “Οἰκουμένα” (“Айкумена”) Беларускага грамадскага аб'яднання грэкаў “Пелапанэс” на беларускай і грэчаскай мовах. Важнымі тэмамі на старонках выдання былі не толькі сучасныя падзеі, але і напамін пра трагічныя старонкі мінулага. У гістарычнай памяці пантыйскіх і прыазоўскіх грэкаў значнае месца займае генацыд грэкаў малаазійскага Понта ў 1916–1923 гг. [29]. Многія з тых, хто ўратаваўся тады, пераехалі на тэрыторыю Расіі і пазнейшага СССР і перадалі памяць аб трагічных падзеях сваім нашчадкам. Беларускія грэкі таксама падтрымліваюць сувязі з грэчаскімі дыяспарамі краін СНД. Так, “Пелапанэс” супрацоўнічае з міждзяржаўным аб'яднаннем грэкаў СНД “Понтас”, у 2006 годзе дэлегацыя з Беларусі прымала ўдзел у адкрыцці помніка савецкім воінам у Афінах, а ў 2007 г. была на Байкануры падчас запуска касмічнага карабля з касманаўтам Фёдарам Юрчыхіным на борце [11].

Грэчаская дыяспара Беларусі, нягледзячы на яе малалікасць, актыўна займаецца захаваннем нацыянальных традыцый і прасоўваннем грэчаскай культуры ў грамадстве. Заўважальная і яе роля ў міжкультурным дыялогу, жыцці праваслаўнай царквы і развіцці ўзаемапавагі паміж розным этнічнымі групамі. Гісторыя грэкаў Беларусі яшчэ патрабуе глыбокага і ўсебаковага вывучэння.

## Літаратура


1. Всесоюзная перепись населения 1926 г. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://www.demoscope.ru/weekly/ssp/ussr_nac_26.php?reg=3. – Дата доступа: 14.06.2022.
2. Всесоюзная перепись населения 1939 г. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://www.demoscope.ru/weekly/ssp/sng_nac_39.php?reg=3. – Дата доступа: 14.06.2022.
3. Всесоюзная перепись населения 1959 г. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://www.demoscope.ru/weekly/ssp/sng_nac_59.php?reg=3. – Дата доступа: 14.06.2022.
4. Всесоюзная перепись населения 1970 г. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://www.demoscope.ru/weekly/ssp/sng_nac_70.php?reg=3. – Дата доступа: 14.06.2022.
5. Всесоюзная перепись населения 1979 г. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://www.demoscope.ru/weekly/ssp/sng_nac_79.php?reg=3. – Дата доступа: 14.06.2022.
6. Всесоюзная перепись населения 1989 г. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://www.demoscope.ru/weekly/ssp/sng_nac_89.php?reg=3. – Дата доступа: 14.06.2022.
7. Национальный состав населения Республики Беларусь: статистический бюллетень. -– Минск, 2020. – 26 с.
8. Трофимович, А. Откуда в Молодечно греки? / А. Трофимович [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: https://aif.by/dontknows/_otkuda_v_molodechno_greki. – Дата доступа: 01.06.2022.
9. У Гароднi гасцей прывячалi, сустракалi, як родных сваiх... / А. Гузень [i iнш.] // Гродзенская праўда. – 2000. – 6 чэрвеня. – С. 1–2.
10. Греки [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://nationalcultures.by/advisory-board/. – Дата доступа: 01.06.2022.
11. Артеменко, О. Белорусская Эллада / О. Артеменко // Гродзенская праўда. – 2008. – 11 чэрвеня. – С. 28.
12. Свята дружбы ў горадзе над Нёманам / А. Гузень [i iнш.] // Гродзенская праўда. – 1998. – 26 мая. – С. 1–2.
13. И миф, и песня, и душа // Гродзенская праўда. – 2006. – 7 чэрвеня. – С. 6.
14. “Сiртакi” – вiзiтоўка Грэцыi // Гродзенская праўда. –2002. – 11 чэрвеня. – С. 3.
15. В центре Гродно – карта мира // Гродзенская праўда. – 2018. – 6 чэрвеня. – С. 4–5.
16. Приходите на наше подворье // Гродзенская праўда. – 2016. – 4 чэрвеня. – С. 4–5.
17. Большой гостеприимный хоровод // Гродзенская праўда. – 2018. – 30 мая. – С. 6–7.
18. Краски и звуки всего мира // Гродзенская праўда. – 2022. – 8 чэрвеня. – С. 10–11.
19. Открытие дней греческой культуры [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: https://nlb.by/content/news/khudozhestvennye-vystavki/otkrytie-dney-grecheskoy-kultury_158193/. – Дата доступа: 01.06.2022.

20. В Минске открылись дни греческой культуры [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: https://budzma.org/news/v-minskye-otkrylis-dni-hryechyeskoy-kultury.html. – Дата доступа: 01.06.2022.

21. Праздник греческой культуры прошёл в Минске [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: https://uk.minsk.gov.by/vse-novosti/739-prazdnik-grecheskoj-kultury-proshel-v-minske – Дата доступа: 01.06.2022.

22. Акімава, Л. Святкуем разам / Л. Акімава // Οἰκουμένα. Друкаваны орган Беларускага грамадскага аб'яднання грэкаў “Пелапанэс”. – 2010. – № 1. – С. 13.

23. Виц-Маргулес, Б. Б. Из истории классического образования на Гродненщине / Б. Б. Виц-Маргулес // Праблемы гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў: мат. навук. рэсп. канф. памяці акад. М. М. Нікольскага і У. М. Перцава, 15–16 ліст. 1999 г. – Мінск., 2000. – С. 97–101.

24. Дельянова, А. Греки есть везде. Даже в Белоруссии / А. Дельянова, И. Шебанец [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: https://www.greekgazeta.ru archives/nomer08/articles/26.shtml. – Дата доступа: 01.06.2022.

25. На ніве беларускай медыцыны // Οἰκουμένα. Друкаваны орган Беларускага грамадскага аб'яднання грэкаў “Пелапанэс”. – 2010. – № 1. – С. 11.

26. Петров, С. Наш архитектор из Греции / С. Петров [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: https://www.sb.by/articles/nash-arkhitektor-iz-gretsii.html? – Дата доступа: 24.06.2022.

27. Имя в белорусской науке: Игорь Александрович Михайлопуло. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: https://csl.bas-net.by/news/one-news.asp?id=71248&ysclid=l4i6gztfgu878999714. – Дата доступа: 24.06.2022.

28. Андреева, Ю. Сорок лет назад артисты Большого театра БССР не хотели петь на белорусском языке / Ю. Андреева [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: https://www.sb.by/articles/sorok-let-nazad-artisty-bolshogo-teatra-bssr-ne-khoteli-pet-na-belorusskom-yazyke.html?– Дата доступа: 24.06.2022.

29. Дэльянаў, Р. Генацыд пантыйскага эленізму / Р. Дэльянаў // Οἰκουμένα. Друкаваны орган Беларускага грамадскага аб'яднання грэкаў “Пелапанэс”. – 2010. – № 1. – С. 4–5.

Статья посвящена греческой диаспоре в Республике Беларусь. В статье описаны статистические данные о численности греков в XX — начале XXI вв., рассказывается о формировании организационной структуры греческой диаспоры, раскрывается культурная и образовательная активность диаспоры на примере межкультурного опыта.

The article is devoted to the Greek diaspora in the Republic of Belarus. The article describes statistical data on the number of Greeks in the 20th - early 21st centuries, tells about the formation of the organizational structure of the Greek diaspora, reveals the cultural and educational activity of the diaspora on the example of intercultural experience.